ГАЗЕТА З БЕЛАРУСІ

# ГОЛАС РАДЗІМЫ

ВЫДАЕЦЦА З 1955 ГОДА ● ● NO.6 (3222) ● ● ЧАЦВЕР, 17 ЛЮТАГА, 2011

ШТОТЫДНЁВІК “ГОЛАС РАДЗІМЫ” МОЖНА ЧЫТАЦЬ У ІНТЭРНЭЦЕ: **WWW.GOLAS.BY**

**Набыць? Лёгка і зручна!**
Да 2015 года ў Мінску пабудуюць дванаццаць гіпермаркетаў **Стар. 2**

**Масты ўзаемнага разумення**
Гісторык, перакладчык, краязнаўца Алесь Баркоўскі старанна будуе культурныя стасункі паміж Беларуссю і Саха-Якуціяй **Стар. 2**

**На цёплай хвалі дабрыні**
Запамінальныя святы “Шчырасць сэрца” ладзяць разам актывісты дабрачынных арганізацый, артысты, прадстаўнікі замежных дыпмісій і бізнесу **Стар. 4**

ГРАНІ ТВОРЧАСЦІ

# Дзівосныя скарбы Наталлі Ермаловіч

## Мастачка з Дзяржынска творыць цуды з гліны, навучае дзяцей свайму майстэрству і лічыць сябе чалавекам шчаслівым

**Лявон Целеш**

За апошнія пару гадоў газета “Голас Радзімы” паведамляла пра розныя культурныя падзеі ў жыцці Дзяржыншчыны, да якіх мела дачыненне гэтая жанчына. Стварэнне дакументальнай кнігі пра вёску, адраджэнне тэатра батлейкі пры сярэдняй школе ў Вялікім Сяле, пленэр з удзелам расійскіх мастакоў… І не толькі гэтыя клопаты Наталлі Мікалаеўны заслугоўваюць увагі. Яна, між іншым, лічыць сябе чалавекам шчаслівым. Бо жыве ў свеце мастацтва, быццам акрылена творчай працай, прыносіць карысць і радасць людзям.

Наталля Ермаловіч — з Дзяржынска родам, пасля заканчэння Беларускага політэхнічнага інстытута тут і жыве. Архітэктар па адукацыі, па прызванні — педагог. Доўгі час працавала ў Дзяржынскай школе мастацтваў разам з мастаком Уладзімірам Шчарбіным. Многія з выпускнікоў школы, дарэчы, сёння ўжо вядомыя мастакі, керамісты, сярод іх і Андрэй Мяцельскі. Творы выхаванцаў пабывалі на шматлікіх замежных і айчынных выставах, аўтары адусюль атрымлівалі ўзнагароды. А ў гонар трох таленавітых вучняў школы, у тым ліку лаўрэата Спецфонду Прэзідэнта Беларусі па падтрымцы таленавітай моладзі Максіма Мяснікова, у Іерусаліме, у Біблейскім садзе, былі пасаджаны тры дрэўцы.

Работы вучняў Наталлі Ермаловіч прадстаўляліся, атрымлівалі ўзнагароды — там адзначалася і яна сама — на выставах у Маскве і Уладзіміры, у Вільнюсе, гарадах Бітала (Македонія), Эвара (Партугалія), Цэле (Славенія) і шэрагу гарадоў Беларусі. Яшчэ дзяўчынкай Наталля засвойвала асновы выяўленчай культуры ад бацькі, Мікалая Антонавіча. Дапамог ісці ў свет мастацтва і яе траюрадны брат Юры Карачун — мастак, мастацтвазнаўца, ён дваццаць гадоў быў дырэктарам Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі. Архітэктурная закваска ў Наталлі Ермаловіч таксама моцная, яна смела эксперыментуе з прасторай, аб’ёмам. Любоў да “рукатворнай адчувальнай формы”, як яна гаворыць, павяла ў керамісты, да працы з глінай, а любоў да дзяцей — у педагогі. У творах Наталлі ўражвае незвычайная свабода лепкі, яны выклікаюць глыбокія асацыяцыі. Лепшыя з твораў разляцеліся па прыватных зборах калекцыянераў ЗША, Францыі, Ізраіля і іншых краін, засталіся толькі на фотаздымках. А ёй і не шкада: мастаку ж заўсёды цікава, каб яго творы “ішлі ў людзі”. ➔ **Стар. 3**

**Цяпер Наталля Ермаловіч збірае скарбы ў Вялікім Сяле**

СТЫЛЬ ЖЫЦЦЯ

# Возера Кромань і яго гаспадар

## Навуковец Яўген Рахманько не толькі ставіць амбіцыйныя мэты, але і дасягае іх

**Іна Ганчаровіч**

Такімі людзьмі, як Яўген Рахманько, нельга не захапляцца. Бо ён — з ліку тых цягавітых беларусаў, хто можа ідэі і нараджаць, і ўвасабляць іх у жыцці. Масціты вучоны, прафесар, доктар хімічных навук, Яўген Міхайлавіч загадвае кафедрай аналітычнай хіміі ў Беларускім дзяржуніверсітэце. Ён жа — старшыня навукова-тэхнічнага вытворчага кааператыва “Аналіз Х”. А з некаторага часу і дырэктар Рыбалоўна-турыстычнага комплексу “Кромань”. Рахманько ўмее не толькі з прыбыткам працаваць па асноўнай спецыяльнасці, але і брацца за рызыкоўныя праекты. І дзеля чаго ж? “А каб даказаць, што не толькі руйнаваць мы ўмеем, але і аднаўляць прыродныя комплексы”, — шчыра, без усялякіх агаворак прызнаўся мне вучоны. Што ж, такі “ненавуковы эксперымент” заслугоўвае пільнай увагі. Ужо хаця б таму, што ў Беларусі — тысячы азёр. Велізарнае багацце, якому патрэбна сёння як дзяржаўная ахова, так і дбайныя гаспадары, здольныя працаваць на перспектыву.

**На возеры Кромань — цудоўны адпачынак**

Возера Кромань вядомы навуковец Яўген Рахманько ўзяў у арэнду напрыканцы 2003 года, каб арганізаваць там бізнес на рыбалцы. Як вядома, сярод мужчын нямала аматараў гэтай справы. А праз некаторы час гаспадар возера зразумеў: хуткага прыбытку з яго не атрымаеш, можна і ўвогуле застацца без фінансавага ўлову. І тады, не пакідаючы задуму пра платнае аматарскае рыбалоўства, ён паставіў мэту яшчэ больш амбіцыйную: адрадзіць возера Кромань да таго ўзроўню рыбнасці, які быў 200, а то і 500 гадоў таму. ➔ **Стар. 3**

# У электронным фармаце

**Беларуская чыгунка ўвяла анлайн-сістэму продажу праязных білетаў**

Цяпер у Беларусі купіць білет на цягнік можна не выходзячы з дому ці офіса. У прэс-цэнтры Беларускай чыгункі паведамілі, што анлайн-сістэма продажу праязных дакументаў магчыма па банкаўскіх пластыкавых картках, а таксама з выкарыстаннем інтэрнэт-банкінгу. На першым этапе паслугай змогуць скарыстацца толькі ўладальнікі пластыкавых картак “Беларусбанка”. Дарэчы, цяпер на сайце www.poezd.rw.by пасажыры могуць знайсці актуальную інфармацыю пра расклад руху цягнікоў, кошты праезду, наяўнасць свабодных месцаў у вагонах. Зайшоўшы на сайт, кліент можа набыць праязны дакумент на пэўны цягнік — унутры краіны ці міжнародны.

ГАНДАЛЬ

# Набыць? Лёгка і зручна!

## Да 2015 года ў Мінску пабудуюць дванаццаць гіпермаркетаў

Як паведаміў намеснік старшыні Мінгарвыканкама Уладзімір Калтовіч, цяпер у сталіцы працуе 9 гіпермаркетаў і 6 харчовых супермаркетаў. Актыўна ствараюцца буйныя гандлёвыя сеткі па продажы розных тавараў. Сярод іх "Суседзі", "Рублёўскі", "Еўрагандаль", "Віталюр", "Ома", "Палас", "Электрасіла", "Пяты элемент" і іншыя.

Толькі летась у Мінску былі адкрыты 222 аб'екты гандлю і грамадскага харчавання: 115 магазінаў плошчай амаль 40 тысяч квадратных метраў і 107 аб'ектаў грамадскага харчавання амаль на 4000 месцаў. Усяго ж у сталіцы цяпер 3149 магазінаў, 43 буйныя гандлёвыя цэнтры, 26 рынкаў, у тым ліку 7 рынкаў Гандлёвага дома "Ждановічы".

БЕЛТА

У адным з мінскіх гіпермаркетаў

ТАЛАКА

# Час збіраць кнігі

Іван Ждановіч

**Нашы землякі ў Таліне ствараюць Грамадскую бібліятэку імя Уладзіміра Караткевіча**

Кожная суполка беларусаў у замежжы — адметная, і досвед адных энтузіястаў не заўсёды зручна пераняць іншым. Справа ж, якой заняліся землякі ў Эстоніі, можа мець паслядоўнікаў. З дасланага ў рэдакцыю ліста вынікае, што пры Нядзельнай школе беларускай культуры імя Уладзіміра Караткевіча ў Таліне адкрыта Грамадская бібліятэка. "Яна створана дзякуючы неацэннай дапамозе пасольства Беларусі ў Эстоніі, — паведамляе Артур Цурбакоў, кіраўнік Нядзельнай школы і асацыяцыі Еўрапейскіх грамадзянскіх ініцыятыў. — Добрая справа пачалася летась, у юбілейны для Караткевіча год. Мне падаецца, бібліятэка стане годным помнікам пісьменніку, які шмат зрабіў для нашай Бацькаўшчыны, краіны еўрапейскай гісторыі і культуры. Асаблівы сэнс праца набывае і таму, што Талін — культурная сталіца Еўропы 2011".

Артур Цурбакоў — грамадзянін Беларусі, жыве ў Эстоніі чацвёрты год, ён адзін з аўтараў і вядучы эстонскай радыёпраграмы на беларускай мове "Бацькаўшчына". Летась, дарэчы, мы змяшчалі яго допіс "Талін гаворыць па-беларуску". Дзякуючы стыпендыяльнай праграме ўрада Эстоніі Артур закончыў магістратуру адзялення міжнародных зносін у Талінскім тэхнічным універсітэце. Цяпер ён паведамляе, што ідэю бібліятэкі ў Таліне падтрымалі многія на Радзіме, ім нашы землякі ў Эстоніі вельмі ўдзячныя.

"Бібліятэка імя Уладзіміра Караткевіча — вельмі важны дапаможнік для развіцця беларускай дыяспары ў Эстоніі, — піша А. Цурбакоў. — Памяшканне размешчана вельмі ўдала: у старым горадзе, у будынку насупраць сімвала Таліна, царквы Олевістэ". Месца наведваюць шматлікія турысты Таліна, таму ў Артура ёсць ідэя зрабіць шыльду бібліятэкі з лагатыпамі спонсараў і гэтак прыцягнуць увагу не толькі да культуры, але і да эканомікі Беларусі.

А кнігі, сродкі для развіцця культурнай установе цяпер вельмі патрэбныя. Суайчыннікі з ахвотай прымуць любую дапамогу ў камплектаванні яе фонду — ад спонсараў, мецэнатаў і шырокага кола кнігалюбаў. Энтузіясты разлічваюць на падтрымку прадпрымальнікаў — як з Беларусі, так і з замежжа, якія з павагай ставяцца да культурнай спадчыны.

Наваколле бібліятэкі ў Таліне

# Паездкі з камфортам

**На прадпрыемстве "Белкамунмаш" асвояць выпуск аднавагонных дызель-цягнікоў**

Беларуская чыгунка і мінскі завод "Белкамунмаш" падпісалі дамову на выраб і пастаўку шасці аднавагонных дызель-цягнікоў. Яны будуць выкарыстоўвацца на ўчастках, дзе няшмат пасажыраў.

Такія дызель-цягнікі, кошт там крыху больш за 8 мільярдаў рублёў кожны, чыгунка плануе набыць за сродкі інавацыйнага фонда Міністэрства транспарту і камунікацый.

Вытворчасць прынцыпова новай тэхнікі на "Белкамунмашы" будзе арганізавана сумесна з польскай кампаніяй "Pesa" па ініцыятыве Беларускай чыгункі. Плануецца, што першыя дызель-цягнікі прыйдуць на магістраль ужо ў сёлетнім жніўні. Як абяцаюць вытворцы, беларускія дызель-цягнікі будуць мець высокія тэхнічныя характарыстыкі і належны ўзровень камфорту. Плануецца, што ў далейшым на "Белкамунмашы" пачнецца вытворчасць сучасных двух- і трохвагонных дызель-цягнікоў. З часам яны і заменяць састарэлы рухомы састаў рыжскай вытворчасці.

ЗЕМЛЯКІ

# Масты ўзаемнага разумення

## Гісторык, перакладчык, краязнаўца Алесь Баркоўскі старанна будуе культурныя стасункі паміж Беларуссю і Саха-Якуціяй

Адам Мальдзіс

Гадоў дваццаць мы знаёмыя, ды і цяпер я цвёрда не ўпэўнены, якую ж мову лічыць у Алеся Баркоўскага роднай. На беларускую ён перакладаў творы Міхаіла Лермантава, Уладзіміра Высоцкага і (з польскай) Тадэвуша Лады-Заблоцкага, на рускую — беларускага празаіка і драматурга Францішка Аляхновіча, польскага празаіка і нарысіста, ураджэнца Пінска Рышарда Капусцінскага (выбраныя раздзелы яго рамана "Імперыя", прысвечаныя Сібіры), беларускага і польскага падарожніка і этнографа Адама Каменскага-Длужыка, на якуцкую — прысвечаныя Усходняй Сібіры артыкулы беларускага пісьменніка Сяргея Палуяна. Як бачым, Алесь Баркоўскі — асоба, па меншай меры, трохмоўная.

І нарадзіўся беларусіст не ў Беларусі, а ў пасёлку Асятрова Іркуцкай вобласці: туды накіравалі на работу яго бацьку пасля заканчэння школы Міністэрства ўнутраных спраў у Ашхабадзе. Паходзілі бацькі з Міханавіч, што пад Мінскам, у 1963-м з Сібіры яны пераехалі ў Дзяржынск, Алесь па даўняй традыцыі называе горад Койданавам. Там юнак закончыў школу. Затым яго зноў паклікалі сібірскія прасторы: вучыўся на суднавадзіцельскім аддзяленні Якуцкага рачнога вучылішча, працаваў у Ленскім і Якуцкім параходствах, здабываў золата на Алдане.

І што самае цікавае: увесь час, будучы ў аддаленні ад прарадзімы, Алесь Баркоўскі не забываў пра яе. З яго актыўным удзелам у Якуцку была заснавана беларуская суполка "Суродзіч", выдавалася газета "Паўночнае зьзянне". У штомесячніку Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў "Кантакты і дыялогі" друкаваліся яго артыкулы пра ўспрыманне ў Якуціі творчасці Янкі Купалы і Максіма Танка. Ён знайшоў у якуцкіх архівах мноства дакументаў пра беларусаў, сасланых у Сібір пасля паўстання 1863 года, на пачатку XX стагоддзя. Асаблівыя заслугі Алеся Анатольевіча — у высвятленні біяграфіі і збіранні творчай спадчыны беларускага, рускага і якуцкага паэта і даследчыка Івана Ласкова, што нястомна выступаў за праўдзівае адлюстраванне якуцкай мінуўшчыны.

Алесь Баркоўскі — чалавек шчодрай душы, ён робіць Бацькаўшчыне каштоўныя падарункі. Неяк пабачыўшы, што ў музейнай экспазіцыі "Беларусы ў свеце" пры Цэнтры імя Францішка Скарыны не стае якуцкага матэрыялу, прывёз кнігі і брашуры, а потым перадаў і вялікі збор перакладаў беларускай літаратуры на іншыя мовы. Калекцыя займала цэлую шафу! Яе так і называлі: "шафа Баркоўскага". Нядаўна гэты збор перайшоў у Нацыянальную бібліятэку Беларусі.

І зусім нядаўна Алесь Баркоўскі двойчы заглянуў у рэдакцыю газеты "Голас Радзімы". У Дзяржынску ён цяпер даглядае хворую маці. Але такі няўрымслівы чалавек не можа доўга заставацца без літаратурнай працы. І ён пачаў… ператвараць у кнігі прывезеныя з Якуціі рукапісы. Кожная з іх выдадзена "ў Койданаве", "у друкарні Кальвіна, накладам 8 экземпляраў для хатняга ўжытку": раздрукавана на ратапрынце і пераплецена. Па адным экземпляры кожнага з 16 (!) новых выданняў ён прывёз у Мінск, перадаў як падарунак у навуковую бібліятэку Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў. Астатнія сем камплектаў прызначаны для іншых бібліятэк і архіваў Мінска і Якуцка.

Што ў гэтых 18 тамах сапраўднага культурнага моста паміж Беларуссю і Саха-Якуціяй? Чатыры кнігі прысвечаны спадчыне Івана Ласкова. Гэта — пасмяротна складзены зборнік яго вершаў і паэм "Кніга блуканняў", выдадзены з рукапісу раман "Эпілог" (пра беларускага ўдзельніка паўстання 1863 года, закінутага лёсам у Сібір), беларускі пераклад "стралецкай быліны" XVII стагоддзя "Пішчальнікі не пішчаць" — аб прыгодах беларускага і якуцкага падлеткаў на шляху да Ленскага астрога і, урэшце, падрабязная бібліяграфія твораў Ласкова і яго дзённікі. Усё гэта, разам узятае, — надзейная аснова для будучых друкаваных выданняў пісьменніка.

Пералік новых імёнаў і твораў, уведзеных Алесем Баркоўскім ва ўжытак, можна доўжыць і доўжыць. Адзначу яшчэ толькі адно выданне, якое мяне асабліва зацікавіла ды і расчуліла. Гэта — "Выбраныя працы па эвенах і іншых народах Поўначы" майго земляка, ураджэнца і цяпер жыхара Астравецкага раёна Сцяпана Казлоўскага. Ён многа падарожнічаў па Якуціі, апісваў і замалёўваў побыт яе народаў, знайшоў сярод юкагіраў сваё асабістае шчасце. Вялікую каштоўнасць маюць успаміны гэтага вандроўніка пра сустрэчы з Максімам Танкам, працытаваныя там яго лісты. Аказалася, што ў свае маладыя гады, прабываючы ў Вільні, паэт ведаў бацьку Сцяпана Казлоўскага, члена Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі, разам з ім удзельнічаў у падпольнай рабоце.

Чытаеш такое з думкай, што свет сапраўды глабалізуецца, становіцца цесным. Дзе тыя эвены і юкагіры, а дзе Астравецкі раён… І тым больш радуе, што знаходзяцца людзі, якія будуюць паміж імі масты ўзаемнага разумення. Мовы розныя, а быццё — агульнае. А яшчэ думаецца: як шмат можа зрабіць для збліжэння народаў нават адзін таленавіты чалавек.

ГРАНІ ТВОРЧАСЦІ

# Дзівосныя скарбы Наталлі Ермаловіч

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)

Яшчэ адзін клопат Наталлі Мікалаеўны — стварэнне асветніцкага і культурна-экалагічнага цэнтра ў вёсцы Вялікае Сяло, недалёка ад Дзяржынска. Там шмат ужо зроблена. Побач са школай, старэйшай на Дзяржыншчыне, у драўляным будынку месціцца Цэнтр народнай творчасці. Там Наталля Ермаловіч гаспадыня. І ўжо можна пабачыць шмат унікальных рэчаў з даўняга сялянскага побыту: абразы, прылады працы, куфар, калаўроты, вырабы мясцовых умельцаў... Дарэчы, расшукваць і набываць экспанаты Наталлі Ермаловіч актыўна дапамагаюць мясцовыя жыхары, асабліва школьнікі. Там ужо ёсць печ для абпальвання керамікі, працуюць розныя гурткі. У добраўпарадкаванні музея ёй дапамагае і вядомы майстар-гадзіншчык Андрэй Мартынюк. А тэрыторыю пры музеі, школе ўжо ўпрыгожваюць кампазіцыі з валуноў, апрацаваных скульптарам Віталем Чарнабрысавым. Ён жа высек з каменя і ўсталяваў у цэнтры вёскі крыж на месцы разбуранай у 30-я гады царквы. Наталля Ермаловіч плануе збудаваць побач з крыжам і каплічку — паказвала мне яе макет — у памяць продкаў, што загінулі пад час мінулых войнаў.

Юныя мастакі ахвотна прыязджаюць на пленэры да Наталлі Ермаловіч

Мясціны, у якіх цяпер шчыруе таленавітая жанчына, дзівосныя: непадалёк — зона зімовага адпачынку "Якуцкія горы", рукой падаць да гары Дзяржынскай-Святой, найвышэйшай у Беларусі. Побач з вёскай шуміць гай рэдкай у нас карэльскай бярозы і шматлікія крынічкі выбіваюцца з-пад зямлі, бягуць ручаямі ў рэчку Перакульку. Упэўнена Наталля Ермаловіч: з цягам часу тут будзе шмат турыстаў і Цэнтр народнай творчасці яны ніяк не абыдуць бокам. Ужо цяпер сюды на пленэры ахвотна едуць мастакі. У прыватнасці, прывозіць выхаванцаў з Гомеля выдатны мастак-педагог Васіль Сідарэнка. Сам з абмежаваным слыхам, ён атрымаў мастацкую адукацыю ў Санкт-Пецярбургу, цяпер кіруе ўзорнай студыяй пры гомельскім Доме культуры глухіх, выкладае ў мастацкай школе ў класе для вучняў з абмежаваным слыхам. У летні час у Вялікім Сяле ветліва сустракае гэтыя творчыя дэсанты Наталля Ермаловіч. Дзеці адпачываюць, з задавальненнем малюць навакольныя пейзажы. Для кожнага з юных мастакоў знойдзецца ў яе ласкавае слова, добрая парада, цеплыня душы. Дарэчы, і двух сыноў яна цудоўна выхавала: Мікалай стаў архітэктарам, Аляксей — інжынерам.

## У суполцы – аптымісты

**Актывісты Ерэванскай беларускай абшчыны Арменіі "Беларусь" удзельнічалі ў юбілейнай вечарыне, прысвечанай 10-годдзю Каардынацыйнага савета нацыянальных меншасцяў**

На ўрачыстасці прысутнічаў Прэзідэнт Арменіі Серж Саргсян, які наведаў павільёны нацыянальных меншасцяў, дзе была арганізавана выстава дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва розных абшчын. Можна было пабачыць розныя сувеніры, нацыянальныя касцюмы, прадметы побыту.

Пад час святкавання прайшоў канцэрт. Выступалі і прадстаўнікі абшчыны "Беларусь", паказвалі жартоўны нумар "Ад панядзелка да панядзелка", які паставіла кіраўнік мастацкай самадзейнасці суполкі Жанна Нікітчук-Бадалян. Нягледзячы на тое, што тэкст гучаў па-беларуску, нашым суайчыннікам удалося развесяліць залу.

Беларуская абшчына — адна з самых малалікіх у Арменіі. Аднак яна ж — і адна з самых актыўных, у ёй працуюць аптымісты, а выступленні мастацкага гурта суполкі заўседы выклікаюць у гледачоў станоўчыя эмоцыі.

СТЫЛЬ ЖЫЦЦЯ

# Возера Кромань і яго гаспадар

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)

Тут варта патлумачыць, што Кромань — гэта адзіны прыродны вадаём у паўднёвай частцы глухіх лясоў і балотаў старажытнай Налібоцкай пушчы. Возера вельмі прыгожае, амаль ідэальна авальнае па форме, крыху больш за кіламетр у шырыню і амаль паўтара ў даўжыню. Навуковец, вядома ж, цікавіўся: што за назва ў возера, якое значэнне мае? Пакуль пошукі тыя нічога не далі. А гісторыя ў месца славутая. Як сцвярджаюць гісторыкі, знатная шляхта, князі Вярэйскія, Радзівілы, Сапегі, Сангушкі, Храптовічы наведваліся на Кромань, у якім тады было вельмі шмат рыбы, у тым ліку — асятры, вугры, стронга (па-руску — "форель"). І ракаў там лавілі штогод нямала на вяльможныя сталы. Пазней, з пачатку 20-х і аж да 1939-га, каля возера — а яно на тэрыторыі Заходняй Беларусі — збудавалі селішча польскія асаднікі, былыя польскія жаўнеры і афіцэры: ім за розныя заслугі далі землі "ў крэсах усходніх". Потым было ўз'яднанне Беларусі ў верасні 1939-га, вайна… Дарэчы, дасёння ацалелі падмуркі хат асаднікаў, як і старая ліпа, якую, кажуць, пасадзіў у 1932 годзе сам вярхоўны галоўнакамандуючы Войскам Польскім Юзаф Пілсудскі.

"Занырнем" яшчэ раз у гісторыю возера — геалагічную. Кромань нездарма называюць пярлінай Налібоцкай пушчы: у возеры надзвычай чыстая вада і незвычайная будова. І як магла ўтварыцца ўпадзіна глыбінёй каля 27 метраў, калі наўкол абсалютна раўнінны лес — тое застаецца загадкай. Паводле старажытнага падання, возера ўтварылася на месцы старога касцёла, які раптам сыйшоў пад зямлю. Існуюць і розныя павер'і, напрыклад, пра тое, што дно Кромані зноў павінна паўстаць, выраўняцца. А больш уражлівыя людзі, кажуць, часам чуюць там гул званоў са дна возера. Між іншым, у Яўгена Міхайлавіча ёсць уласная версія паходжання возера, і яе, правёўшы гідрахімічныя доследы, пацвердзілі супрацоўнікі ўніверсітэта. "У даледавіковы перыяд тут былі горы з глыбокай цяснінай якраз у тым месцы, дзе цяпер знаходзіцца возера Кромань, — лічыць ён. — Пазней, як прыйшоў ледавік, уся гэтая тэрыторыя пакрылася тоўстым пластом лёду. Кавалкі разбуранай пароды, лёду запоўнілі катлавіну, а пасля яго раставання і ўтварылася возера. Думаю, што дагэтуль вельмі глыбока пад землёй можа быць лядоўня, якая падсілкоўвае возера прэснай вадой. І таму верагодна, што з часам Кромань стане яшчэ глыбей — вядома ж, калі працэсы яго зарастання не стануць дамінаваць".

Яўген Рахманько на возеры Кромань не госць, а дбайны гаспадар

Вось якраз такога знікнення возера, з-за яго зарастання, Яўген Міхайлавіч і асцерагаецца, паколькі сам не толькі заўзяты рыбак, але і яшчэ вялікі аматар прыроды. "Я нарадзіўся недалёка ад Карэліч, у вёсцы Заполле, адкуль да возера Кромань кіламетраў дваццаць, — расказвае ён. — Раней тут вадзілася вельмі шмат рыбы: ляшчы, плоткі, акуні, яршы, шчупакі, карасі, ліні. Былі і ракі, а да сярэдзіны 60-х і вугор. На жаль, з часам усё стала мяняцца, і далёка не ў лепшы бок. Вугор знік пасля таго, як перагарадзілі плацінай Нёман. А ракі перавяліся, бо возера забруджвалася і паступовага зарастала. І добрую буйную рыбу вылавілі браканьеры: возера ж было нічыйным…. Наогул, калі можна так сказаць, Кромань стала паступова ператварацца ў яршова-пескаровы вадаём".

З самага пачатку справы, калі Яўген Рахманько ўзяў возера ў арэнду, ён планаваў частку грошай укладваць у яго аднаўленне. Найперш абвясціў бязлітасную барацьбу браканьерам. Затым запусціў у возера шчупака, ляшча, карася. Пабудаваў утульныя дамкі для адпачывальнікаў, абсталяваў месцы для кастрышчаў, масткі для лоўлі рыбы з берага, для аматараў лоўлі на глыбіні арганізаваў пракат лодак. І нават стварыў уласны тэлеканал "КРОМАНЬ ТВ", з перадач якога можна шмат даведацца пра ўнікальнасць Налібоцкай пушчы, гісторыю краю, а таксама пра сакрэты рыбнай лоўлі.

Як запэўнівае Яўген Міхайлавіч, сёння Кромань па рыбных запасах — адно з лепшых азёр Беларусі. Прынамсі, па лоўлі шчупака, плоткі і ляшча. Гаспадар Кромані лічыць, што дзякуючы яго намаганням возера "аднавілася да антрапагенных часоў", — гэта значыць да тых, калі яно было недаступным для браканьераў.

Увесну пачнецца яшчэ адзін этап аднаўлення Кромані: у яго запусцяць віды рыбы, якія былі там толькі гадоў 100–200 таму: асятра, стронгу, вугра. Так што хутка, са слоў Яўгена Міхайлавіча, Кромань будзе "сучасным Эльдарада" для прыхільнікаў усіх відаў рыбалкі. А ўнікальная прырода, выдатны сэрвіс на яго базе і ўвогуле зробяць адпачынак незабыўным.

ПЛАНЕТА ЛЮДЗЕЙ

# На цёплай хвалі дабрыні

## Запамінальныя святы “Шчырасць сэрца” для дзяцей са школ-інтэрнатаў ладзяць разам актывісты дабрачынных арганізацый, артысты, прадстаўнікі замежных дыпмісій і бізнесу

**Іван Іванаў**

У вестыбюлі атэлю “CROWNE PLAZA Minsk” усё, здаецца, аж свяцілася ад шырока раскрытых дзіцячых вачэй, ад усмешак. І як, скажыце, тут справіцца з эмоцыямі святочна прыбраным хлапчукам і дзяўчынкам, калі сустракаюць іх як дарагіх гасцей. І бэйдж са сваім імем кожны па спісе атрымлівае, прышпільвае — бы на канферэнцыі… Такое ў кіно толькі пабачыш. Калі ж госці агледзеліся, справіліся з першымі эмоцыямі, іх суправаджаюць на трэці паверх, дзе бляску яшчэ болей.

Яркае ўражанне ад свята — дыскатэка з Інай Афанасьевай

А далей закруціўся вірлівы калейдаскоп з гукаў, блікаў, колераў, танцаў, эстрадных і цыркавых нумароў… І вельмі шмат было ўсяго смачнага на сталах пад час святочнага абеду. А потым — дыскатэка, вялікая анімацыйная праграма з прызамі! “Усе нашы 68 выхаванцаў і цяпер пад вялікім уражаннем ад свята, — расказаў пазней па тэлефоне дырэктар Чэхаўшчынскай дапаможнай школы-інтэрната, што ў Валожынскім раёне, Арцём Барысавіч Балабан. — Мы прапанавалі ім намаляваць тое, што запомнілася, а малюнкі разам з падзячным лістом ужо накіравалі арганізатарам свята”. Тут да месца ўдакладніць, што сярод іх — уладальнік міжнароднай сеткі атэляў “Прынцэс Атэль”, інвестар і мецэнат Судзі Озкан, міжнародныя грамадскія аб'яднанні “Незалежная дапамога дзецям” і “Медыцына і Чарнобыль”.

“Свята “Шчырасць сэрца”, на якое мы запрасілі амаль 140 дзяцей са школ-інтэрнатаў Асіповічаў і вёскі Чэхаўшчына, — гэта працяг вялікай праграмы дабрачынных мерапрыемстваў, якія мы сумесна праводзім для дзяцей-сірат і дзяцей-інвалідаў Беларусі, — гаворыць старшыня аб'яднання “Незалежная дапамога дзецям” Таццяна Кот. — Не першы ўжо раз свае сэрцы адкрываюць для тых, каму вельмі патрэбна такая падтрымка, заслужаная артыстка Беларусі Іна Афанасьева, кампазітар і спявак Аляксей Крэчат, іншыя артысты. Свята дапамагалі зладзіць прадстаўнікі Савета Міністраў, міністэрстваў аховы здароўя і адукацыі”. Таццяна Аляксандраўна вельмі ўдзячная лёсу за знаёмства з турчанкай Айдан Чынгел, адным з дырэктараў атэля “CROWNE PLAZA Minsk”, — дзякуючы яе шчырай зацікаўленасці сталі магчымымі такія прыгожыя, яркія дабрачынныя праекты, на мерапрыемствах пабывала каля тысячы дзяцей і падлеткаў з розных рэгіёнаў краіны.

“Яшчэ гадоў дзесяць таму мы з аднадумцамі спрабавалі ладзіць для дзяцей са школ-інтэрнатаў падобныя святы, праводзілі нават конкурс “Запалі сваю зорку!”, каб стымуляваць іх творчую актыўнасць, — расказала мне, рыхтуючыся да выступлення, спявачка Іна Афанасьева. — Сёння я вельмі рада, што так шмат людзей ужо супрацоўнічаюць у гэтым кірунку, і сотням дзяцей могуць падарыць радасць, усмешкі. З маіх калег па эстрадзе актыўна выступаюць на дабрачынных канцэртах Аляксей Хлястоў, Ядзвіга Паплаўская і Аляксандр Ціхановіч, Іскуі Абалян, гурт “Чук і Гек” і шэраг іншых. Нас ужо шмат, мы — добрая сіла! Дарэчы, я не раз пераконвалася і сама, што, шчыра аддаючы іншым, ты і сам становішся багацейшым — на душы пасля такіх выступленняў заўсёды вельмі прыемна, адчуваеш сябе ўзвышана. Так што мая парада ўсім: не стамляйцеся рабіць дабро!”

# Тры вобразы князёўны Тараканавай

**Мюзікл “Блакітная камея” хутка адправіцца ў гастрольнае вандраванне**

Прэм'ера спектакля з поспехам прайшла ў Беларускім дзяржаўным акадэмічным музычным тэатры Беларусі. Цяпер у планах яго стваральнікаў — паказаць мюзікл у абласных цэнтрах краіны, а таксама і на Міжнародным фэсце мастацтваў “Славянскі базар у Віцебску”.

Дарэчы, мінчане сталі трэцімі, хто паставіў спектакль кампазітара і прадзюсара Кіма Брэйтбурга. Пакуль мюзікл ідзе толькі ў Краснаярску і Уфе, у некалькі іншым варыянце. У Мінску па выніках кастынгу, які прайшоў яшчэ ўвосень, сфарміраваны тры саставы яго галоўных герояў.

У аснову сюжэта спектакля пакладзена гісторыя кахання князёўны Тараканавай, прэтэндэнткі на расійскі прастол, і графа Арлова, фаварыта Кацярыны II. На ролю князёўны Тараканавай адабраны заслужаная артыстка Беларусі Ірына Дарафеева, актрыса Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра Ілона Казакевіч, а таксама студэнтка Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Кацярына Муратава.

КРЫЖАВАНКА

# Зімовыя святы

**Па гарызанталі:**

5. … дзень, ці провады Калядаў. Адзначаўся 20 студзеня: у гэты святочны дзень пілі хрышчэнскую ваду і нічога не рабілі. 6. Недарэчная памылка. 9. Свята вялікай пакутніцы, памочніцы жанчын: адзначалася 7 снежня. 10. …, ці памужненне. 11. Кароткае набажэнства: яго служылі ў цэрквах беларускіх вёсак 2 студзеня, на свята Ігната Баганосца. 14. …, ці плот. Пасля Калядаў на … адпраўлялі свае “грахі”, звязаныя з забаронай шыць, прасці. 15. Вяжучае адчуванне ў роце ад чаго-небудзь кіслага. 16. …-Перазімнік: святы мучанік, дзень якога адзначаўся 14 лютага. “На … зорнае неба — вясна будзе позняй” (прыкм.). 19. … — не мука (прык.). 22. …, ці Вадохрышча. Вялікае праваслаўнае свята, калі ў царквах асвячаецца вада: адзначаецца 19 студзеня. 25. Зіма — …, лета — матачка (прык.). 26. …, ці Стрэчанне. Адно з найвялікшых святаў, якое прыходзіцца на 15 лютага. “Калі на … мароз — будзе хутка вясна, а калі не — чакай яшчэ снег і мароз” (прыкм.). 27. Святы … Так у мінулым дзе-нідзе на Беларусі называлі Навагодняе свята, 1 студзеня. 28. …, ці гусляр. У беларускай міфалогіі магмузыка, вяшчун, волхв.

**Па вертыкалі:**

1. Вукола … Свята, якое адзначалася 19 лютага: у гэтую пару пачыналіся ацёлы кароў. 2. Дрэва, усходні платан. 3. Свята жывёлы, якое прыходзіцца на 24 лютага. “Ва … і барада ў масле” (прык.). 4. Дзень святога Апанаса, ці …: адзначаўся 31 студзеня. З гэтага дня гусей кармілі зернем. 7. Адзін з персанажаў калядавання. 8. … -Аўчар, ці Зімабор. Святы, які клапаціўся пра авечак: яго дзень адзначаўся 28 лютага. 12. Люты халодны і сухі — … гарачы (прыкм.). 13. Святая мучаніца. Яе дзень адзначаецца 25 студзеня, свята студэнтаў. “Калі на … снег, будзе дажджлівае лета” (прыкм.). 17. … Хрыстова. Найважнейшае праваслаўнае свята, якое адзначаецца 7 студзеня. 18. Вусная народная творчасць, сукупнасць народных абрадавых дзеянняў. 20. Свята закаханых: адзначаецца беларусамі-каталікамі 14 лютага. 21. Дамашняя птушка, у беларускай міфалогіі ўяўляецца вяшчунняй. 23. Жанчына, якая займаецца шыццём. 24. Стрыжань для змацоўвання драўляных канструкцый.

Падрыхтаваў **Лявон Целеш**

**Адказы на крыжаванку**

**Па гарызанталі:** 5. Лянівы. 6. Лапсус. 9. Каляднічка. 10. Стагнанне. 11. Малебен. 14. Парэкан. 15. Аскома. 16. Трыфан. 19. Навуйка. 22. Кшчэнне. 25. Сакрыха. 26. Праміцыя. 27. Козлік. 28. Лірнік.

**Па вертыкалі:** 1. Ілярыён. 2. Чынара. 3. Ўлассе. 4. Гусяніх. 7. “Кабыла” 8. Аніцім. 12. Жнівень. 13. Таццяна. 17. Рэство. 18. Фальклор. 20. Вялікдзень. 21. Курыца. 23. Швачка. 24. Нагель.

Заснавальнік: Рэдакцыя газеты «СБ»
Рэдактар Віктар Харкоў
Адрас: пр. Незалежнасці, 44, Мінск, 220005
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 61
Тэлефон рэдакцыі: +375 17 288—12—80; факс: +375 17 288—12—80
Бюро па рэкламе: Тэл. +375 17 290—60—11
E—mail: golas_radzimy@tut.by
Газета надрукавана на Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку»
Аб'ём выдання: 1 друк. арк.
Тыраж: 1960
Заказ: 204
Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках “Голасу Радзімы”, могуць не супадаць.
© “Голас Радзімы”, 2011